**Цэна асобнаго н ўмэру 5 кап.**

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна также падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей,, хто нэ захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія тольві для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

**Год X.** **13 Лютаго 1915 г.** **№ 6**

## ВАЙНА.

На *левым беразі Віслы* адбылося колькі слабых нямецкіх атак, а расейцы ўзарвалі нямецкі акоп, ад чаго праціўнік меў страты каля 500 людзей.

**У Галіччыне і на Карпатах**, як і паміж Віслай і Нёманам бітвы адбываліся дужа заўзятые. Асабліва аўстро-нямецкае войска напірало тут са стараны *Дунайца* і, найболей са стараны *Карпацкіх праходоў*. Глаўным пунктам змаганьняў—мейсцэ між *Тухлай і Вышковам*. Тут напірало нямецкае войска, як відаць з мэтай аткрыць сабе дарогу к Стрыю і Львову, але, як бачым з вестак Штабу, гэта немцам не ўдалося. 4 лютаго ў Карпатах расейцы адбілі цэлы рад заўзятых аўстрыяцкіх атак. На фронце ад Свідніка да верхняго Сану, ў районі Козювкі, Тухлы, Сонечува, Вышкова і Клаусе, неперэстаючы карысна адбіваць безупынные атакі немцоў, расейцы зрабілі колькі карысных проці-атак. У *Буковіне* расейскіе атрады адыйшлі за Прут. 5 лютаго на фронце Дунайца частая перастрэлка. Проба аўстрыякоў прыбліжыцца к расейскаму левабярэжнаму укрэпленьню каля Отсінова не ўдалася. На Карпатах у районі Ясёнкі і к поўначы-ўсходу ад Стропко расейцы адбілі колькі непрыяцельскіх атак. Ў районі Вышкова неспыняюцца заўзятые бітвы. 6 лютаго на Дунайцу каля Жабно расейцы адбілі наступленьне аўстро-нямецкаго атраду. На Карпатах расейцы адбілі зацятые атакі каля Ясёлкі, Стронко і Мезолаборча. Асабліва заўзятые былі атакі немцоў на фронце між Тухлай і Вышковам. У районі Клауса расейцы пасунуліся з боем наперад. 7 лютаго адбіты атакі праціўніка ў районі к поўначы ад Заклічына. Бітвы між Мезалаборчам і верхнім Саном не спыняюцца, прычым расейскіе і нямецкіе атакі ідуць па чародзі. Расейскае войска пасьля страшэнна заўзятаго бою заўладала высотамі на паўдня-ўсход ад Тухлы і на поўнач-заход ад Сенечува. У паўдзённай Галіччыні непрыяцель заняў Станіслаў. 8 лютаго у Заходней Галіччыні непрыяцель падтрымліваў сільны гарматні агонь. Ў Карпатах расейцы заўладаўшы высатой Смольніка, адбілі поўтарные атакі аўстрыякоў. У Ўсходней Галіччыні к паўдня-ўсходу ад Станіслава ў районі Краснэ—Небылов—Перэхіско расейцы атакавалі аўстрыякоў і пасьля заўзятаго бою, даходзіўшаго да штыхоў, аткінулі дзьве іх брыгады, пасьля чаго адбілі проці-атаку немалых непрыяцельскіх сіл. 9 лютаго заўзятые атакі аўстрыякоў у районі Мікув—Смольнік—Ціскова адбіты з вялікімі для іх стратамі. К поўдню ад Доліна і каля Станіславова заўзятые бітвы з вялікімі сіламі праціўніка. 10 лютаго ў Карпатах ідзе заўзяты бой к усходу ад Лупкова. Атакі немцоў ў районі к поўдню Ад Козювкі адбіты болей на поўдня ад Тухлы. Пасьля страшэнна заўзятай бітвы расейскае войска заўладала высотамі праваго берагу Рожанкі. На шляхах к Доліне і Галічу расейцы стрымалі наступленьне вялікіх непрыяцельскіх сіл.

**С Каўказкаго фронту** нічога важнаго Штаб не абвесьціў.

**На Заходнім фронце** без перамен.

## На вайне і каля вайны.

**Ўзмацованая пазыція.** Цікавае апісаньне сучаснай пазыціі даець «У. Р.»

Непрыступнасьць цяперашняй пазыціі вельмі мала павялічываюць перашкоды самой прыроды—ўзгоркі, канавы, стрэмніцы. Сіла агню творыць іншые перашкоды, іншую непрыступнасьць: лепшая абарона пазыціі — роўны, гладкі абшар перад ёю, па мажлівасьці са скатам у старану ворага. Перэмагчы гэткі аткрыты абшар, заліты з пярэдніх акопаў градам олава, каштуець шмат ахвяр нават пры варунках разсыпнога строю і пераскочэк.

Рэдка ўдаецца нямецкім атакам, ідучым густымі калоннамі перэмагчы гэту страшную паласу, аткрытую для стрэльбавога і кулямётнаго агню, і што цягнецца часамі на некольскіх сотняў сажняў. На працяг некольскіх дзесяткоў сажнёў ад акопоў, там, дзе агонь дасьцігае найбольшаго прыцэлу і сілы, устаўлюцца загароды. з дроту.

Пры славах, загароды з дроту, можна падумаць што гэта калючые адгародкі, падобные да тых, што робюцца па вёсках. А гэта зусім інакшые: забіваюць у зямлю калы адзін ад аднаго на 1 с пал.— 2 аршыны, забіваюцца у рад на ўсю даўжыню пазыціі, а у шырыню у некольні сажняў. Ўвесь абшар паміж іх запутаны калючым дротам. Прайсьці праз гэту абгароду мажліва толькі, або заваліўшы яе прынесенымі с сабою шчытамі, або перарэзаўшы і зністожнўшы. Ўсё гэта прыходзіцца рабіць пад градам волава. А часам праз дрот пускаецца самы сільны ток электрычэства!. Немцы першые пачалі рыць у зямлі шырокіе ямы і хаваць там драцяные загароды, ладзючы іх роўна з зямлёй. Геткім парадком тые ваякі, што падцікаюцца рэзаць дрот, будуць ўвесь час пад агнём Драцяные загароды заўсёды ідуць побач у два а часамі у тры рады.

На раней ўзмацованай пазыціі акопы робюцца натта моцные, каб баранілі ад куль і шрапнэляў. Над абшырнымі і глыбокімі канавамі робюцца моцные стрэхі — «бліндажы» з бярвён, часамі нават з жалезных бэляк, абсыпаных тоўстым пластам зямлі. Бруствер, іначэй вал на пярэдняй сьцяне акопу і бліндажы сьціснуты, а толькі рад невялікіх дзюрак «бойніц» адкрываецца з акопу у старану праціўніка. Праціў добра уладжэных акопоў палевая артылерыя нічога ня можэ рабіць: каб прабіць двух-аршынную насыпу бліндажоў, патрэбны грозные набоі цяжкай артылерыі.

Вось якіе самые важныо абароны сучаснай узмацованай пазыціі. На іх далёка яшчэ не кончуцца сучасные спосабы вайны: яшчэ астаюцца міны і фугасы страшные найболей, у моральным значэньню. Пасьля ёсьць ручные гранаты, якімі спатыкаюць адзін аднаго блізкіе праціўнікі; «мінэнвэрфэры»—станкі для кіданьня мін.— «Мінэнвэрфэры» кідаюць свае набоі на невялікую далечыню, усяго на некольні дзесяткоў сажняў, але у кожным з іх ёсьць па некольні пудоў ўзрыўных саставоў...

**Нямецкіе шчыты.** Карэспандэнт «Daily Chronice» паведамляе, што немцы у сваіх апошніх атаках на Ізэры карысталіся вялізарнымі шчытамі—выхіленые сталёвые доскі. Кожны такі шчыт закрывае сабою чатырох салдат, пры гэтым, удвух нясуць шчыт, трэці знаходзіцца у сярэдзіне і стрэляець са стрэльбы праз невялікую шчэліну ў шчыці, а чацьвёрты ідзець ззаду і кідаець ручные гранаты. Гэткім парадкам, можна казаць, што вярнуліся часы пунічных войнаў.

## КАТ.

Першы кур пяе.. Паўночная гадзіна.
Маўклівы чорны кот праз мой пакой бяжыць.
Жудасьці і страхі ткуць свае тканіны.
Зданьнё вядзе свой сьпеў: «Ня трэ', ня трэба жыць!..»

Сэрцэ маё штосьці важнаго чэкае.
Груган шуміць ў вакно Груган— мой родны брат.
Аб кананьнях—муках мне Ноч-Смерць гукае...
О, буду я купацца у крыві, я—кат!

Бацька мой і дзед былі так-сама каты.
У спадчыну астаўся мне ад іх тапор.
Над людзьмі твару ім гібелі і страты,
Нарэзаў ім галоў у сотні груд і гор...

Кур другі пяе... Усё безупынна б'ецца
Груган у маё вакно. Тапор зык выдаець...
С каменнай сьцяны у рукі мае рвецца,—
Ен хочэ нішчыць ўсіх, усюль рабіць канец?..

Даўнюю іржу гарачаю крывёю
Задумаў выцярці цяпер на новы лад.
Мацней дрыжыць топор — не мае супакою,
І нібы ён жывы... і нібы вельмі рад...

У крывавы пурпур апранусь з ахвотай!
Ахвярамі людзкімі вельмі я багат!
Восьцер мой тапор! Я маю шмат работы!
Вось трэці кур пяе... Я—кат! Я—мсьцівы кат!

1/II—15 г. **Ясакар.**

## З народных песень.

**Зашумела яліначка..** *)

Зашумела яліначка позна а паўночы,
Затужыўся бел малойчык на вайну ідучы.
Затужыўся, занудзіўся і стаў паміраці...
Ах вы брацьпя—чужапанцы учыніце волю,
Прывядзіце мне коніка ды з усею зброяй.
Як я сяду, я паеду, аж на вайне стану.
Заржы, заржы, сівы коню, хоць раз пада мною,
Каб зачула мая матка у маей старонe!—
Як зачула, уздыхнула, сільна заплакала:
Каб я была зявюлечка, яжбы паляцела.—
Памёр, памёр бел малойчык у нядзелю рана,
Палажылі малойчыка ў сьвятліцы на лаўцэ,
Пахавалі малойчыка у траўцэ-мураўцэ.
Прыляцела зязюлечка ды сказала куку;
Падай, падай, мой сыночэк, хоць правую руку.
Ай рад-бы я, мая маці, абедзьве падаці:
Сыра земля, жоўты пясок, не можна мне ўстаці.
Ляцеў пятух цераз рэчку, крыкнуў кукурыку;
Ня відзела матка сына, не увідзіць да веку!

*) *J. Czeczot* «Piosnki wieśniacze z nad Niemna i Dźwiny». Вільня 1846 г.

## На парозі будучыны.

Ніхто ня можэ стрымаць, ніпто ня можэ спыніць людзей у парыві да сьветлай праўды, да заваеваньня права «людзьмі звацца».

Вось сеюцца зёрны прасьветы на роднай глебі беларускай. Вось, рунеюць усходы. Праўда, яны пакуль што кволые і бледные: вораг ноччу на полі ўзараным пырэй ды рожнае дзікае зельле засевае, дык ціж можэ паміж лапухоў красавацца прыгожая багатая колерамі кветка?

. . . . . .

...Бацька, селянін-гаротнік яшчэ крэпкі у надзеі, што да канца вынясе на сваіх плечах і руках мазольных яшчэ не мала гора, покі прыйдзе падмога.

— Чэкай! Дасьць Бог, сынок падрасьце, аддам у навуку вывяду ў людзі,—ўсё-ж маё сэрцэ пацешыцца, убачу яго ня цёмным і забітым, як я...

І аддаў сына ў навуку.

Прайшоў сынок «азы» у школцы, пасьля «азы» з «букамі» складаць навучыўся і... пайшоў у валасьць за пісара, ці ў горад за чыноўніка, ці на чыгунку за кандуктара. Ды як-бы яго й не было!

Стары засмуціўся...

— Дзе твой сын? — пытае сусед.

## ГАРОТНІК.

С тых, даўнейшых часоў, калі цемры багоў запрудзілі зямлю крывічан, калі ўзгорак—курган трымаў цяжкі аўтар, чуў малітву, браў дар, піў гарачую кроў, калі грозны Пярун для людзей і багоў богам быў, — вось тады тут праслыў, на шырокі прастор, цёмны бор. Над борам густы віўся дым; дым ішоў дзень і ноч, бо, як краскі, двое воч, поўны жаха к лясуну, агонь старажылі... Так было гэта тады. Дзе-ж вы, слаўные гады, дзе—што з вамі жылі? Сумна, пуста так без вас... Гэй, ажыйце яшчэ раз, дайце моц сваю для нас, дайце, дайце! Я, ваш брат,—хаця трошкі буду рад, буду біцца да скананьня, аж вярну вам панаваньне.

Так. Было гэта тады; праплыло ой шмат вады. Дзе быў калісь цёмны бор, цяпер сатканы з ніў узор, а на узгорку, каля шляху, дуб астаўся; не мала жаху ён наводзіць на людзей. Увесь крывы, а верх зламаны і трухлявы; чэрві у раны патачылі усе бакі, як-бы рукі, два сукі, без кары і вузлаваты ў верх з мальбой падняты.

І памёршы стаіць сведкай вякі і жывець ён, як гаротнік які.

* *

Калядны вечар. Маладзік. Земля чорная, у гразі, абматаная імглой, як павуцінай. А цепліня-ж, цепліня!.. Жыта можэ сапрэць, чэрві множуцца. Эх, німа той калядніцы, аб якой гукаюць дзяды, калі сьнег у пояс, а ад марозу аж іскры сыплюцца, птушкі калеюць, аж дрэва покаецца! Але мне цэпліня мо і на руку, бо ня выдзержаў-бы я такой сьцюжы: не такі я, як дзядзька Габрусь—дзеведзесят сем год, а здаровы як рыжык. Эх, завідна! Добра, што цёпла, бо ляжу я сабе пад гэтым страшным дубам, спаць хочэцца — выпіў крыху (трэба-ж было паддзержыць кумпанію, а то сказалі-бы: пагарджае) ды замарыўся, пляндруючы па вёсках с казой.

Дзе каза ступой—там жыта капой.
Дзе каза рогам—там жыта стогам.
Дзе каза ходзіць—там жыта родзіць.

Куды гэта толькі мае сябры падзеліся? здаецца выйшлі ад Янкеля усе разам: Макляк, Дармаед, Шчарбук... Хм! Ат, калі галава мая любіць часам дурэць, і робіць гэтым мне не мала клопату, як той ядынака у бацькоў. Вось хоць сабе на тым вясельлі. Седзяць гэтаго людзі, баўбочуць, сьмяюцца, сілкуюцца мокрым і сухім, а яна, галава мая, трах! і задумалася, і, калі усе ўсталі піць здароўе маладых, я са шкалікам у руках, з мінай якбы трэба было пераскочыць шырокі роў, крэкнуў: хай жывець Беларусь! Або сягоньня вось: закруціцца, замуцціца с казой пайсці!.. Хоць ты лёд к галаве прыкладай. Бацькі моршчуцца, што... шляхоцкі сын... не выпадае... што там нейкі «рубель — ня грошы, мужык не брат...» можэ ад сястры адбіцца... ды шмат што іншае. Ну, але галава мая захацела, значыць, пайшоў... А—о! якіж гета стары сядзіць на супраціў.

— Хто ты?

— Лясун.

— А ідзі ты ў балота! Збрыд ты мне, як мазоль: куды не павярнуся, усё лясун ды лясун.

— Ды ужо, ці ведаеш, і ты мне нарабіў такой ікаўкі, што ў мае белые гады і пры маім здароўі...

— А што-ж такое?

— Жывот, разумееш, не травіць: ня тые часы, еда не тая... Ужо колькі-то вякоў прашу у неба змілаваньня.

Тут я нехаця аглянуўся. Ой-ёй-ёй! то-ж дуба нема. І жудасьць мяне ахапіла, і ўцекаць хочэцца. Але адумаўся, што так неяк выгадна, соладка лежаць, а гэты стары камель ляпечыць, як тое лісьце ў восень, як каплі вады пры млыне-руіне, — дык я і астаўся.

— А цікаўна усё-ж-ткі, што ты ясі?

— Мёд. Ох! даўней, бывала, куды не глянiш: дупло паўнюсенькае, як вока, мёду, а цяпер перапорыш увесь луг і чуць знойдзіш шмялёва гняздо, дзе больш чарвей, як мёду. Але скажы мне, юначэ, хто ты будзеш?

— Я той, с каго сьмяюцца, або старонюцца, як ад пошэсьці якой. Бо не таючы нашу у грудзях найдаражэйшы свой скарб: любоў да гэтаго краю. Я ёсь частка гэтай зямелькі звільжэнай потам і крывёй. Я верны сын Крывічанскай зямлі.

— О, такога мне і трэба. А скажы ты мне, ці ў цябе зубы мудрасьці ўжо вырасьлі?

— Ёсь—сказаў я наўгад.

— Ага! Ну, дык я с табой магу пагутарыць аб важных справах.

— Хі-і! сколькі хочыш і аб чым хочыш. Абач, лясун: я цябе ужо накармлю мёдам, вымажу, нават, калі хочыш, толькі ты мне пажажы...

— Ведаю, ведаю, аб чым...

І ён, лясун, пачаў мне казаць...

. . . . . . . . .

Радасьць. Не, не радасьць. Гэй, назавіце вы самі гэта перэжываньне, калі магутная вера, непакананая сіля ачышчаюць сьлязьмі вочы, затуманеные буднімі справамі, і заменяюць цябе ўсяго у эфір, у прамень, а ты ляціш тады не паўстрыманы усюды, дзе ёсьць жыцьцё, ляціш без канца і жывеш, жывеш, жывеш...

— Стой, лясун, годзі! у мяне мёду ня хопіць. Я ужо шчасьліў ад тваіх багатых слоў, я шчасьліў, што другіх магу ашчасьлівіць. Глянь! Глянь, вун, з-за туману сумнай далі плывець і плывець табала, гушча шэрых, ашуканых людзей, плывець, як морэ-акіян з дрыгвы лясоў на горку ка мне, каб дастаць сонцэ і галавой упёрціся у неба, каб сьвет шырокі пабачыць і сьвету паказацца у ўсім багацьці, у ўсей красе сваей!..

О, хай зайздруюць ім людзі, хай неба дзівуе!

Я бачу свой ціхі, а любы мне край, я сею, лясун, твае словы і бачу густы ўсход вялікаго шчасьця... Ха-ха-ха!

— Чаго сьмяешся? — гыркнуў на мяне лясун.

— «Брацьця, ці зможэм грамадзкае горэ, брацьця, ці хваце нам сілы?» Уха-хе! Як гэта гаворка выдаецца цяпер пустой, сьмешнай!.. На што сумлеваньне!? Сьмела, разам у перад, бо за нас праўда, Бог і сіла Часу! Мой ты лясун, ой, палюбіў-жэ я цябе! дай пацалую, укушу, сьцісну, каб аж костачкі хрумснулі. Чым я табе адслужу, чым? На, хоць закуры, а мо да Янкеля зайдзім. Га?

— Ат! Вось лепш не забудзься што я табе казаў.

— Эхо-ха! Лясун, хоць у цябе казлячые ногі, аднакжэ ты глупства гародзіш. Я, Л. Р., маю забыцца твае словы-полымя, тваю жывучую праўду...

— Уставай, валакіта, каб ты гарачку на-

— Німа, — кажэ, — сына. Як пайшоў, так і не вярнуўся. Німа...

— Э-э-э! — уздыхне сусед, — ляпей было больш да сахі ды бараны гнуць, а то навукі захацеў. Вось табе й навука.

А што-ж той сын?

— Дзе твае бацькі? — запытаецe у яго.

— Німа бацькоў.

— А дзе ты радзіўся, у якой губэрні, значыць.

З мінскай.

С самаго Мінску, ці з ваколіц?

А... а... З ваколіц... Барысоўскаго павету..

— Каталік, ці праваслаўны?

— А якжэ, я—рускій!

Або:

— Поляк, прошэ пана...

— Так, так, але нешта дзіўна гэта: ў барысоўскім павеці, здаецца, беларусы жывуць?!

— Ня чуў такіх — аткажэ ён.

— Ну, а ўсё-ж ткі ў цябе там астаўся нехта; ці брат, ці сестра, ці маці мо' жыве?

— Жывуць там, але... бачыце, яны крыху зьбяднелі, дык гаспадаркай заняліся, значыцца, мужыкамі парабіліся і гаворуць па просту.

— Ага! так... так... Ну, а кніжкі нейкіе ці газэты чытаеце, Вашэць?

— А якжэ, а якжэ. У нас у упраўленьне прысылаюць «Губэрнскія Ведамасті», дык нават і трэба чытаць, а так, кніжкі, на што мне? Як вучыўся ў народным, дык чытаў, а якжэ, а цяпер—нашто? Дый часу німа глупствамі займацца. Лепей у цырк, ці ў кінематограф, дык і галава да работы сьвяжэйшая. А якжэ...

Пабрабуеш яму ўсунуць кніжку якую.

— Вазьмі с сабою да хаты, прыгледзься, разкумякай.

Возьме, мо' і разгледзіць, мо' і разкумякае. Але ўбачыць у яго тую кніжку таварыш з «Губэрнскіх Ведамастей» і скажэ:

— Што табе: жыць надаела? «Сэпаратызмам» займацца ўздумаў? Глядзі!!.

І... німа кніжкі. Трэба жыць, трэба хлеб есьці...

Вось яшчэ адзін — вышэйшы калібар — гэта ўжо сыны тых кандухтароў, чыноўнікоў, валасных пісароў. Змалку уступіўшы у сьляды бацькоў, ў гімназіі найчасьцей так сама не зыйшоў з настаўленай бацькамі дарожкі. А пад гадоў 22—24 так усё прывітае ў ім акрэпне, што ужо пасьля універсытэту патрэбнасьць есьці «хлеб з маслам» бярэ верх і над сумленьнем і над навукай і ідэйнасьцю...

Яны сьведома ў душу свайго народу сеюць плевель, але хто іх жаць іме?.. Ой, крэпкі селянін беларускі! Ачысьціць ён добрае ад благога. Пакажэ йшчэ сілу сваю і багацьце свае — пабедай! І вернецеся вы тады пад стрэхі бацькоў сваіх, вярнецеся зваеванымі, знябожэнымі.

— Я нявольнік, я цёмны мужык, і песьня мая нікчэмная, і мова мая—ні да чога!—гэтак думае селянін беларускі.

Але падыдзеш да гэтаге чэлавека, расталкуеш яму, як і што, выгарнеш жар з яго грудзей, аб каторым бадай і сам ён ня ведаў, і раздзьмухаеш тое, што тлело у душы яго з даўных часоў, — дык устане перад табой асілак, цьвёрды у сваей гартоўнасьці, крэпкі ў сваей веры ў ясную будучыну.

. . . . . . .

Вось, прыклад з маіх родных бацькоў.

Бацькі мае праваслаўные абое, але маліліся яны двом багам: каталіцкаму і праваслаўнаму,—значыць, у польскай і расейскай мовах адразу. (Гэта часта спатыкаецца у Гродзенскай губэрні). Ведама, не знаючы ні той, ні другой мовы, яны не маліліся, а адгаварвалі свае пацяры, як павіннасьць. Напрыклад, маці казала «Zdrowaś Maгya» так: «Здровацьь Марыя ляскі сьпельня пан тобо благаславя нас ты мендзы невестамі і благаславі абос жывота его Іезус». Дый бацька ня лепей маліўся, бо, калі прыказваў мне гаварыць пацяры голасна, то так папраўляў:

«Не: в о і м я Отца і Сына, а: в і і м я Отца і Сына».

Мо Бог і зразумеў малітву, але яны самі дык напэўна не разумелі...

Калі ж я вырас, прайшоў «азы» і «букі», дык пытаюся што значыць «ві імя», дык бацька кажэ: «разумнейшые за цябе слова Божаго вучылі нас, дык і не тваё дзела нос сунуць». Але пазьней, як я ужо чыноўнікам зрабіўся, а, пачытаўшы крыху кніжэк, ведаў, што і як да чаго, дык бацька саўсім шчыра прызнаўся, што ткі ляпей было-б маліцца па свайму, па просту значыць, чым па панску, не разумеючы, бо: «у Бога усё аднакова, што пан, што мужык...» Толькі мучыло яго пытаньня: чаму ў касьцелі ды цэркві не робяць так? Хіба што забаронена?...

А вось яшчэ прыклад. Адзін раз, калі ігралі беларускі тэатр, я павёў с сабой дзяўчыну, што у суседа служыла, і народную вучыцельку, прыехаўшую да сястры. Абедзьве дзеўчаты выраслі у вёсцы.

Пільна прыгледаўся да твараў дзеўчат, як пачалася ігра, і дзіва: Гэтая слуга, дзяўчына-гаротніца мела так шырока раскрыты вочы, што, здавалося, яе нейкім абухам трэснулі па галаве, і яна акамянела ад здзіўленьня. А у часе антракту на яе твары, я бачыў, гуляла шчасьлівая усьмешка, а вочы такімі былі глыбокімі і задуманымі, што, здавалося, во-во толькі што яна была на тым сьвеці і маці яе нябошчыца прыгартала яе да сябе і пеяла тую самую песьню, што над калыскай дзіцячай даўно-даўно...

А вучыцелька? Што-ж, не магу сказаць, каб у яе не прабудзілося нешта падобнае. Але гэта ўжо было інакшае. На твару вучыцелькі было напісано: «Мо' яно й добра, мо' яно так і трэба, мо' і я гатова пеяць разам,—але што я!? То-ж мяне засьмяюць, закідаюць! Што Анна Ивановна сказала-бы? Што Кирил Өедорович падумаў-бы? а што інспэктар?..

А прыгледзьцеся што робіцца с селянінам на лекціях аб агрономіі коопэрацыі, што робіцца з ім, калі ён ўпершкі ўбачыць друкованае, ці пачуе з вуснаў інтэлігента жывое беларускае слово?..

. . . . . . .

Будзіцца Беларусь. Чэлавек па чэлавеку будзіцца, хата па хаці заводзіць новы лад, чэзнуць манапалькі, адкрываюцца коопэратыўные хаўрусы, пашыраецца і крэпнець думка аб адраджэньні народу.

Над сынам не сумуй, бацька, што пакінуў цябе! Ёсьць ужо німала людзей, што ўсе сілы свае аддаюць на палепшэньня быту твайго, што сьвет і цяпло ўносяць у хату тваю, што цьвёрда стаяць за цябе супроць ворагоў.

Скора, скора наступіць час, калі прыйдзе да цябе блудны сын твой, што пакінуў цябе. Прыйдзе і на калені упадзе, а ты падымеш яго, пацалуеш і разам за стол цясовы пасадзіш.

**Піліпоў.**

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны.

**Абавязываючые пастановы.** 1) Пад карай да 3000 руб. штрафу або 3 мес. турмы ці крэпасьці, забараняецца прыватным асобам вывазіць з гор. Вільні і Віленскай губэрні за межы губэрні жыта, жытнюю муку, пшаніцу, пшанічную муку, авёс, гарох, цукер, газу і соль. 2) Пад карай да 500 руб. штрафу або да 3 х мес. арышту, забараняецца як прыватным

---

спаў! Я табе выганю народны дух, бокам ён табе палезе! І я пачуў зусім непрыемнае тоўханьне ў бок нагой і, ведама, тут-жэ прачнуўся. Гэта быў мой тата; ехаў ён з матуляй ад гасьцей і вось каля гэтаго дуба конь іх спужаўся мяне і ані з мейсца.

— Ну садзіся, паедзім! Чаго стаў, насланьнё, болька ты нашая, — гыркнуў бацька.

— А я табе даўно казала спаліць яго кніжкі з гэным конскім языком, — сыкнула матуля.

— Гаў—гаў—уу!—завыў недзе сабака.

Тап, тап!—закапала на мяне с сукоў дуба. Я стаяў, як пень разбітаго пяруном дрэва, я стаяў, як скамянеўшы, бо з неспадзеўкі забыўся... словы лясуна.

О, людцы, ратуйце мяне, ратуйце тых, каму сэрца вырываюць з найдрабнейшымі жыламі, ратуйце, хто давіцца клёцкай; ай, ратуйце хутчэй ад бацькоў т а к і х!

О, мудрасьць людзкая! о, грошы і сіла!

. . . . . . . .

А дуб памёршы стаіць сьведкай вякі і жывець ён як гаротнік які.

**Л. Р.**

# Грыгор с Касатаукі *).

«Прывялі тым часам мяне у стан. Прыстаў спаў яшчэ, дык трэба было чэкаць пакуль устаніць. Сеў я на лаві каля порога, дзесяцкі каля мяне, другі — у дзьвярох стаіць. «Што са мной зробюць?—пытаў я сам сябе,—што зробюць?—нічога. Распытаецца прыстаў; раскажу яму ўсё, як было, усю праўду і адпусьціць мяне. Я-ж нічога ні зрабіў, а што ў шафі сядзеў, дык гэта-ж паня сама «мяне схавала». Але як успомніў я на паню, як яна бедная глядзела на мяне, дык аж мурашкі па скуры пайшлі, аж сэрцэ зашчымела мне. Так шкада стала яе! «Ну,—думаю,—не скажу, што гэта яна мяне схавала. Увайшоў прыстаў. — «Чэсьць маю далажыць Вашаму Высакородзю,—пачаў вураднік, — што сягоньня ноччу арыштаваў зловумышленьніка». — «Дзе, якога?»—пытае прыстаў. — «А во!—паказаў вураднік на мяне. — Атрымаўшы паведамленьне ад пана Ківата, што ў яго дом забраўся зловумышленьнік, пайшоў я з дзесяцкім і, знайшоўшы яго ў шафі, арыштаваў. Пры вобыску знайдзены пры ім вось гэтые рэчы», — закончыў вураднік, паказываючы пісталет і палярэс.—«Ты хто, аткуль, чаго забраўся ў дом?»—Грозна звярнуўся да мяне прыстаў. Пачаў я тут апаведаць усё па праўдзі аж да таго мейсца, пакуль увыйшоў ў дом. Тут якбы хто падказаў мне, — такая думка шчасьлівая блiснула ў галаве:—«нічога, кажу,—ня помню, як я апыніўся у шафі; п'яны, кажу, я быў,—выеыджаючы выпіў шмат, скалеў дарогай, а як увыйшоў у цёплы пакой дык і разабрала мяне гарэлка.»—«Брэшыш сабака,—буркнуў прыстаў,—лепей прызнавайся, такі ты ды гэтакі, што ты думаў утварыць!»—Як перад Богам, кажу, паночак, праўду. Нічагусінькі ня помню». А прыстаў: «У кандалы, — крычыць, — закую цябе, душу с цябе выкалачу, у вастрозі згнаю, а прызнаесся ты ў мяне!»

«Урэшці адвялі мяне у арыштанскую, што пры стані. Шэсьць дзён сядзеў я тамака і кожны дзень вадзілі мяне да прыстава. Але як ён ўжо там не дапытываўся і чаго не рабіў, — «нічога, кажу, ня помню, п'яны быў і ўсё».

«Вось такім манерам, ніякаго ад мяне не дабіўшыся толку, адаслаў мяне прыстаў у горад у вастрог; і адтуль сталі мяне вадзіць да сьледаваццеля. Атседзіў я ў вастрозі мусіць месяцы с чатыры, бо ўжо аж пасьля Узнясеньня быў суд, каторы, дзякаваць добрым людзям, не абвінаваціў мяне. Бо як выясьнілася, што я, як на тое шчасьце, у гэты вечэр, калі пан паслаў мяне с палярэсам, браў у Лейбыпактара два разы па поўкварты. І хоць гэта не для сябе я браў, але сказаў быццам сам усё выпіў. Дык судзьдзі згадзіліся с тым, што і ня дзіва, калі быў п'яны, выпіўшы кварту гарэлкі. Ды, дзякуй ёй, і паня тая памагла, бо, як я пасьля дазнаўся, колькі разоў была яна у сьледоваццеля і хлапатала або мне, і на судзе усё паказывала у маю карысьць. Даведаўся я пасьля і таго, чаму я уперад за пана прыехаў: не даежджаючы да Загацьця, ў яго зламалася брычка, і Цыпрук—каваль папраўляў яе. Вось каб я, убачыўшы у кузьні агонь, заехаўся туды, спаткаў-бы там пана, аддаў бы яму палярэс і усё было-б добра, і нічога-б ня выйшла благога. Атож трэба было не заехацца!»

Закончыў Грыгор свае апаведаньне і, выпіўшы узноў пастаўленую перад ім чарку гарэлкі, выйшаў, падзякаваўшы за пачастунак.

— Ну,—звярнуўся да нас вучыцель, —ці ня можна у простым, ня хітрым апаведаньні гатаго чэлавека відзець усей прыгожасьці, усяго хараства яго душы?

— Цікава, ў чым гэта можна угледзіць?— адазваўся з усьмешкай, паціскаючы плячмі, студэнт.

— Як гэта,—загарачыўся вучыцель: няго вы ні зразумелі, што ён тут пацярпеў за сваю ідэю, за сваё пераконаньне? Чаму ён не сказаў, што гэта паня яго схавала у шафу? Шак ён ей ні сват ні брат, і ўдзячнасьці ніякай ён ад яе не спадзеваўся. Ён сам гэта тлумачыць тым, што шкода стала яму яе, што надта жаласна яна глядзела, траслася уся з упуду. З аднаго боку гэта так, але карэньня гэтага паступку лежаць глыбей,—лежаць яны у ягонай душы, у ягоным пераконаньні. Ён спагадаў пані, што і яна маіць нрава на сваю долю шчасьця. Ен не знаў ейнаго жыцьця: можэ і яе бацька, як і ягоную Ганачку, выдаў сілком за нямілаго, некаханага. А яму так жадалася хоць адным вокам, хоць раз зірнуць на сваю Ганачку. Хто ведае, можэ гэта доля Ганачкі і вырабіла ў яго такі пагляд на гэту справу. Ен і сам сабе не здаець справы ў гэтым, але гэта так; ён пастуціў толькі павэдлуг свайго пераконаньня. І шмат, ой, шмат ёсьць сярод народу такіх, паступкі каторых здаюцца нам незразумелымі, але ўсе яны выцекаюць з глыбокаго, ім самім нават ня чутнага пераконаньня, з вышэйшага пачуцьця праўды. І каб мы толькі умелі глыбей угледацца у душу народа, дык многа знайшлі-б там прыгожасьці і хараства, — закончыў горача вучыцель.

Мы ўсе глядзелі на яго, слухалі і кожны думаў сваю думку. Нехта глянуў на гадзіньнік. Быў позны час і пара была расходзіцца.

**І. Останевіч.**

10/I—1915 г.

Канец.

*) Гл. „Н. Н.“ № 5.

